# Сімвал зямлі, хлеба і дабрабыту

**У Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі прайшоў рэспубліканскі майстар-клас "Традыцыі і наватарства ў мастацтве беларускай саломкі і іх выкарыстанне ў дзіцячай творчасці". Яго ўдзельнікі — педагогі і метадысты сістэмы дадатковай адукацыі, мастацтвазнаўцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Беларускага саюза майстроў народнай творчасці — абмеркавалі сваю ролю ў захаванні і перадачы традыцый саломапляцення маладому пакаленню, а таксама правялі прафесійны аналіз некаторых выкладчыцкіх методык на яскравых прыкладах работ рэспубліканскай выставы "Залатая саломка".**

Феномен беларускай саломкі заключаецца ў тым, што звычайная сыравіна, пабываўшы ў руках чалавека, пераўтвараецца ва ўнікальныя вырабы. Саломка і ў наш імклівы час не страчвае сваёй прывабнасці, здзіўляючы прыгажосцю і захапляючы ўсё большую колькасць дзяцей і дарослых.

— Гаворачы пра традыцыі беларускай саломкі, трэба ўзгадаць яе абрадавы складнік. Саломка суправаджала чалавека на працягу ўсяго каляндарнага года. Напрыклад, напярэдадні Каляд у сялянскіх хатах нярэдка можна было сустрэць унікальныя падвясныя канструкцыі, так званыя павукі ці ліхтары, якімі ўпрыгожвалі жыллё перад святам. Знешне яны вельмі простыя, але калі не ведаць, па якім прынцыпе яны збіраюцца, то на выраб нават аднаго з іх можна патраціць вельмі шмат часу і яшчэ не факт, што атрымаецца так, як трэба. Таму вельмі прыемна бачыць, што тыя саламяныя павукі, якія вырабляюцца рукамі дзяцей, у большасці сваёй зроблены па ўсіх правілах.

►►► 5 стар.

# Сімвал зямлі, хлеба і дабрабыту

◄◄◄ 1 стар.

Гэта значыць, што наступнаму пакаленню перадаюцца веды пакаленняў папярэдніх, — гаворыць дацэнт кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Вольга Аляксандраўна Лабачэўская. — Адна з балючых кропак мастацтва беларускай саломкі, унікальнасць якой прызнана на міжнародным узроўні, — у нас пакуль што, на жаль, няма памяшкання, дзе былі б сабраны разам работы беларускіх майстроў. А іх столькі, што хапіла б на асобны музей! Педагогам жа ўстаноў дадатковай адукацыі я вельмі хацела б параіць нешта, на мой погляд, вельмі важнае. У аснове вашых заняткаў з дзецьмі павінна быць мэта не вырабіць як мага больш прыгожых работ, якія потым можна было б адправіць на конкурсы-выставы, а данесці да дзяцей значэнне прыроднага матэрыялу. Саломка для беларусаў не проста сыравіна. Гэта сімвал зямлі, хлеба і дабрабыту. Вельмі важна, каб пра гэта дзеці даведаліся ад вас яшчэ на самых першых занятках і ўспаміналі кожны раз, калі будуць трымаць саломку ў руках.



Вольга Аляксандраўна Лабачэўская.



Падчас рэспубліканскага майстар-класа адбыліся прэзентацыі аўтарскіх школ па саломапляценні і творчыя майстэрні, якія было даверана правесці адным з лепшых педагогаў краіны. Ірына Святаславаўна Лялонг з Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі прадстаўляла свой вопыт па тэме "Анімалістычная скульптура". Педагог народнай студыі "Творчая скарбонка" сярэдняй школы № 200 Мінска Галіна Аркадзьеўна Удодава расказала пра складанне кветкавых кампазіцый і букетаў. А педагогі дадатковай адукацыі Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна Раіса Аляксандраўна Раманеня і Тацццяна Мікалаеўна Кудравец падзяліліся сучаснымі тэндэнцыямі вырабу жаночых галаўных убораў. Скажам больш: у адрас Раісы Аляксандраўны прагучала столькі цёплых слоў ад арганізатараў, запрошаных экспертаў і ўдзельнікаў рэспубліканскага мерапрыемства, што мы вырашылі абавязкова пазнаёміцца бліжэй з кіраўніком заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь "Беларускі сувенір" і спецыяльна для гэтага адправіліся ў Салігорск. Пра тое, якім атрымалася наша знаёмства, можна будзе прачытаць ужо ў найбліжэйшым дадатку "Шосты дзень" у наступную суботу.

Кароткі прафесійны аналіз вынікаў сутворчасці педагогаў і навучэнцаў у гуртках па саломапляценні на прыкладзе рэспубліканскай выставы дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Залатая саломка" зрабіў доктар мастацтвазнаўства, прафесар, старшыня Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Яўген Міхайлавіч Сахута.

— Кожны народ мае свае адметныя традыцыі, якія неабходна захоўваць і развіваць, не азіраючыся на іншыя краіны. Беларускія педагогі з гэтай задачай спраўляюцца выдатна, але некалькі заўваг у мяне ёсць, — адзначыў Яўген Міхайлавіч. — У аснове любой традыцыі закладзены пэўны сэнс, які павінен пранізаць кожную работу. У некаторых з іх, прадстаўленых на выставе, я яго не бачу. У прыватнасці, у некаторых аплікацыях з саломкі, аўтары якіх імкнуцца паўтарыць кніжныя казачныя ілюстрацыі, сюжэты дыснееўскіх мультфільмаў і нават фотаздымкаў. Навошта гэта рабіць? Зразумела, з саломы можна настрыгчы ўсё, што заўгодна, яна плакаць не будзе. Але які сэнс у аплікацыях, у якіх адсутнічае не толькі мастацкасць, але і губляецца нават дэкаратыўнасць? І яшчэ адна заўвага. Я разумею прызначэнне, напрыклад, саламяных скарбоначак, але прызначэнне саламяных самакатаў і гітар зразумець не магу. Хаця можна здагадацца, што гэта робіцца для таго, каб прадэманстраваць сваё майстэрства, — маўляў, мы можам вырабіць з саломкі рэч, якая робіцца зусім з іншага матэрыялу. Вельмі добра, што можаце, але перад тым, як рабіць, спытайце самі ў сябе: "навошта?" і "ці ёсць у гэтым сэнс?". Задавацца гэтымі пытаннямі прымушайце і сваіх вучняў.

**Марына ПЫРКОВА.**
*pyrkova@ng-press.by*
**Фота аўтара.**

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ